Стралец М.В., Коршак М.А.

# АСНОЎНЫЯ ЭТАПЫ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКА-НЯМЕЦКІХ СУВЯЗЯЎ

Брэст
Выдавецтва С. Лаўрова
2000

УДК 943.0:947(476)
ББК 63.(4Гем)+63.3(4Беи)
Стре 84

***Адказны рэдактар***

старшыня Брэсцкай абласной арганізацыі Беларускай асацыяцыі палітычных навук, сапраўдны член Акадэміі Сацыяльных навук, прафесар **Каклюхін У. У.**

***Рэцэнзенты:***

доктар гістарычных навук, прафесар ***Іофэ Э. Р.***

доктар філасофскіх навук, прафесар ***Акінчыц І. І.***

кафедра гісторыі Беларусі Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А. С. Пушкіна.

Стре 84 Стралец М.В., Коршак М.А. Асноўныя этапы гісторыі беларуска-нямецкіх сувязяў - Брэст. Выдавецтва С. Лаўрова, 2000 - стар. 68

Аўтары паспрабавалі прасачыць узаемаадносіны паміж беларусамі і немцамі ад сівой даўніны да нашых дзён. Адлюстраваны розныя бакі беларуска-нямецкіх сувязяў.

Брашура разлічана на студэнтаў і выкладчыкаў ВНУ, настаўнікаў сярэдніх школ, усіх, хто цікавіцца пытаннямі айчыннай і ўсеагульнай гісторыі.

ББК 63.(4Гем)+63.3(4Беи)

ISBN 958-6371-53-8

© Стралец М.В., Коршак М.А
© Выдавецтва С. Лаўрова, 2000

# УВОДЗІНЫ

Зараз афіцыйны Мінск лічыць Германію, як і Расію прыярытэтам у знешнеэканамічным і знешнепалітычным супрацоўніцтве[1]. Зразумела, яго перспектывы ў значнай ступені залежаць ад успрымання немцаў беларусамі на ўзроўні масавай свядомасці. Важнейшай крыніцай фармавання гэтай свядомасці з'яўляецца зварот да гісторыі беларуска-германскіх сувязяў.

Рэтраспектыва дадзеных сувязяў сведчыць аб тым, што яны развіваліся няпроста. Складана выдзяліць і асноўныя этапы гісторыі гэтых сувязяў. Трэба мець на ўвазе наступныя моманты.

Па-першае, далёка не заўсёды Беларусь і Германія з'яўляліся суб'ектамі міжнародных зносін. Беларусы і немцы кантактавалі і ў той час, калі той ці іншы бок або абодва бакі не мелі сваёй дзяржаўнасці. Таму няма сэнсу пастаянна казаць пра адносіны Беларусь -Германія.

Па-другое, на працягу значнага гістарычнага адрэзку можна было адзначыць несумяшчальнасць палітычных, эканамічных, сацыяльных сістэм у немцаў і беларусаў.

Па-трэцяе, не ўсе архівы маюцца ў распараджэнні даследчыкаў, што ўплывае на глыбіню высноваў і абагульненняў.

Па-чацвёртае, цяжка выбраць крытэрый для прапановы таго ці іншага варыянта перыядызацыі гісторыі беларуска-нямецкіх сувязяў.

Наш варыянт просты для ўспрымання чытачамі і ў той жа час нясе на сябе пячатку ўмоўнасці. У яго грунце – перыядызацыя айчыннай гісторыі. Паасобку разглядаюцца сувязі з немцамі ў час існавання першых беларускіх княстваў, Вялікага Княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага, Рэчы Паспалітай абодвух народаў, знаходжанне Беларусі ў складзе Расійскай імперыі, у час існавання БССР, а таксама на сучасным этапе.

Аўтары аддаюць належнае А.Він іцкаму, М.Гаранскаму, А.Грыцкевічу, М.Ермаловічу, В.Космачу, І.Саверчанку, Г.Сагановічу, У.Сакалоўскаму, П.Селіванаву, У.Снапкоўскаму, Ю.Туронку, У.Ціхаміраву, Е.Шлоцу, іншым даследчыкам. Яны ўлічвалі вынікі іх працы на прадмет аналізу беларуска-нямецкіх сувязяў у гістарычнай рэтраспектыве.

---

[1] Щедрина О. На европейском векторе политики.// Советская Белоруссия, 1999,13 мая С. 2

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Мы прасачылі гісторыю беларуска-нямецкіх сувязяў ад сівой даўніны да нашых дзён. Настаў час для высноваў.

Раней айчынная гістарыяграфія падавала гэтую гісторыю такім чынам, каб у чытача склалася ўражанне аб рашучай перавазе чорных фарбаў.

І зараз чорныя фарбы абавязкова будуць прысутнічаць у публікацыях любога даследчыка, калі той адрозніваецца аб'ектыўным падыходам. З гісторыі не выкрэсліш набегі нямецкіх крыжакоў, удзел немцаў у паходзе Напалеона на Расію 1812 г., нямецкі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі ў час першай і другой сусветных войнаў.

Разам з тым, праведзены намі аналіз дазваляе даваць больш сбалансаваныя адзнакі. Перш за ўсё даследчык не павінен паддавацца палітычнай кан'юнктуры, быць ва ўладзе эмоцый, кіравацца класавым падыходам. Трэба рабіць акцэнт на агульначалавечае вымярэнне гісторыі беларуска-нямецкіх сувязяў і тады акажацца, што ў рэтраспектыве беларусаў і немцаў больш зближала, чым раздзяляла. Дастаткова ўзгадаць пра гандаль у інтарэсах абодвух бакоў, пра ўзаемны культурны ўплыў, пра ролю нямецкага фактара ў развіцці айчыннага заканадаўства, пра цывілізаванае суіснаванне этнічных немцаў і беларусаў у рамках адной дзяржавы, пра супрацоўніцтва сучаснай Беларусі і аб'яднанай Германіі на прадмет будаўніцтва новай Еўропы. Беларусы і немцы – цэнтральнаеўрапейцы. Сама геаграфія падказвала і падказвае ім неабходнасць узаемапаразумення, сапраўднага партнёрства, рознабаковага супрацоўніцтва.

Патэнцыял двухбаковага супрацоўніцтва далёка яшчэ не вычарпаны. Застаецца спадзявацца, што ў пачатку XXI стагоддзя яно ўздымецца на якасна новы ўзровень.

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ........................................................3

Глава першая. КАНТАКТЫ ПЕРШЫХ БЕЛАРУСКІХ КНЯСТВАЎ З НЕМЦАМІ: ХАРАКТАР, МЭТЫ, МАШТАБЫ........................................................4

Глава другая. БЕЛАРУСКА-НЯМЕЦКІЯ СУВЯЗІ Ў ЧАС ІСНАВАННЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА, РУСКАГА, ЖАМОЙЦКАГА........................................................6

Глава трэцяя. АДНОСІНЫ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ АБОДВУХ НАРОДАЎ З НЯМЕЦКІМІ ДЗЯРЖАВАМІ. РОЛЯ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У ІХ РАЗВІЦЦІ........................................................14

Глава чацвёртая. БЕЛАРУСЬ У СКЛАДЗЕ РАСІІ: НОВЫ ЭТАП У ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКА-НЯМЕЦКІХ СУВЯЗЯЎ.................17

Глава пятая. УЗАЕМАДАЧЫНЕННІ ПАМІЖ БНР І ГЕРМАНІЯЙ. УДЗЕЛ БССР У АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ ПАЛІТЫКІ СССР НА ГЕРМАНСКІМ НАПРАМКУ........................................23

Глава шостая. АДНОСІНЫ РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ – ФЕДЭРАТЫЎНАЯ РЭСПУБЛІКА ГЕРМАНІЯ: ДАСЯГНЕННІ, ПРАБЛЕМЫ, СУПЯРЭЧНАСЦІ, ПЕРСПЕКТЫВЫ................41

ЗАКЛЮЧЭННЕ........................................................63

Навуковае выданне

Стралец Міхаіл Васільевіч
Коршак Міхаіл Антонавіч

**АСНОЎНЫЯ ЭТАПЫ ГІСТОРЫІ**
**БЕЛАРУСКА-НЯМЕЦКІХ СУВЯЗЯЎ**

Рэкамендавана да друку
Саветам Міжнароднага Недзяржаўнага
Інстытута Працоўных і Сацыяльных адносін

Галоўны рэдактар **Лаўроў С.Б.**
Адказны рэдактар **Каклюхін У. У.**
Мастак **Коршак Г.М.**
Тэхнічны рэдактар **Мацвеева Н.С.**

Падпісана ў друк 10.11.2000 Фармат 60x84 $^1/_{16}$
Папера афсетная. Рызаграфія. Гарнітура «Times»
Ум. друк. л. 3,9 Наклад 150 экз.

***Выдавецтва С. Лаўрова***
***(ЛВ № 190 ад 26.02.1999 г.; ЛП № 383 ад 1.03.2000г.)***
***224016, г. Брэст, ул. Куйбышава, 12***
***тэл/факс (0162) 23-27-10***